УДК 008(476)«15/16»

Г. Ф. Швед, выкладчык (БДТУ)

# БЕЛАРУСКАЕ БАРОКА

Беларускае барока, адметны варыянт еўрапейскага, мела значныя мастацкія каштоўнасці. Дзякуючы спалучэнню кніжных і фальклорных традыцый, барока стымулявала на Беларусі пераход да новай літаратуры. Па сутнасці, гэта быў першы агульнанацыянальны стыль, бо ён ахопліваў ўсе класы і саслоўі таго часу, усе віды беларускай культуры. З’явіліся новыя віды і жанры мастацкай вытворчасці. Адкрыўся больш шырокі погляд на свет і чалавека. Веданне гэтага спрыяе развіццю лінгвакультуразнаўчай кампетэнцыі, пашырэнню кругагляду будучых спецыялістаў.

Belarusian Baroque as a distinctive variant of European had significant artistic values. Thanks to the combination of book and folk traditions, Baroque enchased transition to the new literature in Belarus. Essentially, it was the first “nation-wide” style, since it has covered all classes and estates of that time, all genres of Belarusian culture. New types and genres of art had developed an wider view of world and man had opened. Knowledge of this helps to develop linguocultural competence, broadening horizons of future specialists.

**Уводзіны.** У цэлым культура эпохі Контрэфармацыі развівалася ў кірунку барока. Ідэйна-мастацкія крыніцы яго стылю асабліва яскрава выявіліся ў паэзіі (Сімеон Полацкі, Андрэй Белабоцкі і інш.), архітэктуры, скульптуры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Кірунак барока ўзнік у другой палове XIX ст. у Італіі і Іспаніі, у сярэдзіне стагоддзя дасягнуў межаў Беларусі, дзе знайшоў спрыяльную глебу.

Беларуская літаратура і мастацтва канца XVI – першай трэці XVIII ст., эпохі Контррэфармацыі, развівалася пераважна ў рэчышчы барока. Творчыя дасягненні ў гэтым стылі, безумоўна, выкарыстоўваліся контррэфарматарамі ў сваіх ідэалагічных мэтах. Аднак барока як ускладнены (у параўнанні з Рэнесансам) мастацкі кірунак (стыль) умяшчае ў сябе намнога больш шырокі сэнс, чым толькі кансерватыўныя ў цэлым ідэі каталіцкай Контррэфармацыі: ён існаваў не толькі ў каталіцкім, але і ў пратэстанцкім, праваслаўным, уніяцкім асяроддзях (г. зн. стаў агульным для беларускай нацыянальнасці), быў здольны выказваць і «прагрэсіўныя з’явы эпохі» (Дз. Ліхачоў). Будучы другасным (зноў жа ў дачыненні да Рэнесансу) і таму вельмі фармалізаваным, барока лёгка пераступала класава-саслоўныя, нацыянальныя і канфесійныя бар’еры.

**Асноўная частка.** У развіцці беларускай літаратуры і мастацтва эстэтыка барока з’явілася значным крокам наперад, таму што яна несла з сабой новае, ускладненае бачанне свету і чалавека, макра- і мікракосмасу. Узрасло імкненне твораў да сінтэзу, што прывяло да з’яўлення сінтэтычных жанраў (*школьная драма*, пастаноўкі якой суправаджаліся спевамі, танцамі і беларускімі інтэрмедыямі). У розных рэгіёнах Еўропы, у тым ліку і ў беларуска-украінска-літоўскім, агульныя барочныя тэндэнцыі лёгка і хутка ўваходзілі ў кантакт з мясцовымі, часта народнымі традыцыямі, што прыдавала творам, якія нарадзіліся на такім рубяжы, непаўторнасць і нацыянальны каларыт. Гэтае агульнае сцвярджэнне лёгка праілюстраваць прыкладамі, узятымі з беларускага культавага і грамадзянскага дойлідства, выяўленчага, музычнага, тэатральнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (асабліва яркія з іх – драўляныя цэрквы на Палессі, партрэты Радзівілаў, пастаноўкі нясвіжскага прыдворнага тэатра, карэліцкія габелены, шкло, створанае ў налібоцкай і ўрэцкай гутах).

Тыя ж агульныя заканамернасці выявіліся і ў тагачаснай беларускай літаратуры. Яна з’яўлялася састаўной (на жаль, яшчэ не вядучай) часткай шматмоўнай літаратуры Беларусі, куды ўваходзілі творы на польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай і іншых мовах. Барока тут з’яўлялася тады вядучым, але не адзіным кірункам. Яно выступала ў спалучэнні з сярэдневяковымі, рэнесанснымі і раннекласіцыстычнымі з’явамі.

Беларускае барока мела шмат агульнага з Рэнесансам і Сярэдневякоўем, а таксама і адметнага ад іх. У цэлым эстэтыка барока, як і сярэдневяковая, з’яўлялася ідэалістычнай. Прыгожае – сцвярджалі яе тэарэтыкі, у тым ліку М. Сарбеўскі, які выкладаў у Полацкай калегіі на пачатку XVII ст., – у рэальнасці не існуе. Вытокі яго – у духоўным, у душы пісьменніка. Прамое, непасрэднае адвабражанне замянялася ўскосным, адлюстраваным, зашыфраваным. Літаратурны твор ператвараўся ў суцэльную метафару, дзе сапраўдны, скрыты сэнс адной з’явы перадаваўся праз нешта другое, падобнае або палярна супрацьлеглае, набываў шматзначнасць. Чытач або глядач не павінен быў суадносіць прачытанае ці ўбачанае з

жыццём, а толькі параўноўваць з іншымі творамі, інтэрпрэтаваць у адпаведнасці з уласнай фантазіяй. Усё гэта паяднoўвала новы кірунак з Сярэдневякоўем.

Аднак барока з'явілася не толькі адмаўленнем рэнесансных традыцый, але і іх працягам. Сярэдневякоўе тут сінтэзавалася з Рэнесансам, што выявілася ва ўзаемапранікненні мастацкага і навуковага мыслення, «прыемнага» і «карыснага». Было прадоўжана распачатае Рэнесансам разбурэнне сярэдневяковага светасузірання. Жыццё стала паказвацца больш усебакова – у яго дыялектычнай зменлівасці і супярэчлівасці, дынамічным руху, складаных сувязях.

Характарызуючы агульныя рысы барока (супярэчлівае, кантрастнае спалучэнне розных традыцый і тэндэнцый, ірацыянальнага і рацыянальнага пачаткаў, апеляцыя да пачуццяў, эмоцыяў, перавага формы над зместам, алегарычнасць, арнаментальнасць, эмблематычнасць і інш.), трэба акцэнтаваць увагу на тых яго асаблівасцях, якія мелі істотнае значэнне для фармавання новай беларускай літаратуры, беларускага мастацтва.

Найперш тут трэба сказаць, што ў параўнанні з Рэнесансам і класіцызмам эстэтыка барока адрознівалася большай метафарычнасцю, адкрытасцю, «талерантнасцю». Прыхільнікамі новага кірунку не толькі пашыраліся агульнаеўрапейскія каноны, але і дапускаліся адхіленні ад іх. Барока хутка і лёгка засвойвала мясцовыя традыцыі, у кожнай краіне набывала індывідуальнае аблічча. Усходнеславянскаму, у тым ліку і беларускаму барока, такую індывідуальную непаўторнасць надавалі візантыйска-царкоўнаславянскія традыцыі, арыентальныя (усходнія) павевы, выкліканыя кантактамі (у тым ліку і ваеннымі) з мусульманскім светам (туркамі, татарамі), урэшце, глыбінная і трывалая сувязь з народнай творчасцю, язычніцкай міфалогіяй. Барока з'явілася тут першым мастацкім кірункам, які актыўна сінтэзаваў (у беларускай песеннай лірыцы, інтэрмедыі, сатыры) кніжныя, агульнаеўрапейскія элементы з фальклорнымі, мясцовымі. Такая асіміляцыя народных традыцый садзейнічала пераходу да новых мастацкіх формаў, развіццю нацыянальных літаратур, прыпыняла ўтварэнне ў іх класіцыстычных тэндэнцый, варожых у дачыненні да фальклору. Новы кірунак адкрываў прамы, хаця і нялёгкі, шлях да стварэння новай беларускай літаратуры.

Другой асаблівасцю барока, вельмі важнай для разумення заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры і мастацтва гэтага перыяду, з'яўляецца тое, што яно інтэнсіфікавала працэс узаемадзеяння культур, стымулявала абмен мастацкімі каштоўнасцямі паміж славянскімі краінамі і рамана-германскай Еўропай. Узнікнуўшы ў другой палове XVI ст. у Італіі і Іспаніі, новы кірунак да канца таго ж стагоддзя дасягнуў межаў Чэхіі і Польшчы, а адтуль – украінскіх і беларускіх зямель, дзе знайшоў спрыяльную глебу. У ролі пасрэдніка выступала тут польская літаратура, чые прадстаўнікі (Д. Набароўскі, А. Карманоўскі, З. Морштын, М. Сарбеўскі) нарадзіліся або жылі і працавалі на тэрыторыі Беларусі. Пранікненню на Беларусь новага мастацкага стылю і мыслення садзейнічала таксама ўкраінская літаратура, выкладчыкі паэтыкі і рыторыкі Кіева-Магілянскай калегіі (акадэміі). У сваю чаргу беларуская літаратура з'явілася, як і ўкраінская, праваднікoм барочных эстэтычных канцэпцый далей на ўсход, у Расійскую дзяржаву (Сімяон Полацкі, Андрэй Белабоцкі, аўтары беларускіх інтэрмедый, што выконваліся ў Смаленску і Цверы).

Беларускае барока, безумоўна, узнікла і развівалася на хвалі Контррэфармацыі, сярод феадальнай эліты – у магнацкіх палацах, шляхецкіх маёнтках, манастырскіх школах. Аднак няправільна было б, як гэта рабілася ў працах часоў таталітарызму, зводзіць усе яго праявы да рэакцыйна-арыстакратычнага «віцiйства», «пляцення славес». Новы кірунак вызначаўся разнастайнасцю, шматпланавасцю. Па сутнасці, гэта быў першы «агульнанацыянальны» стыль, бо ён ахопліваў усе класы і саслоўі таго часу, усе віды беларускай культуры. І справа тут не ў «стракатасці», якая, па словах Д. Чыжэўскага, арганічна ўласціва барока, а ў тым, што ў межах агульнага кірунку эпохі спалучаліся розныя ідэйна-палітычныя і фармальна-стылёвыя тэндэнцыі.

Барока мела тры «шцілі», што прыйшлі па спадчыне з антычнай паэтыкі. Высокі «шціль», які адрозніваўся ўскладненасцю формы, рытарычнай прыўзнятасцю і метафарычнасцю, знаходзіў на Беларусі прыхільнікаў пераважна сярод апалячанага ўжо магнацтва, вышэйшага каталіцкага, праваслаўнага, уніяцкага і пратэстанцкага духавенства. На гэтым узроўні аўтары часцей за ўсё карысталіся не беларускай, а больш «высокімі» – польскай, лацінскай і царкоўнаславянскай мовамі (старажытнабеларуская ж, якая сустракалася ўжо даволі рэдка, архаізавалася, насычалася царкоўна-славянізмамі і лацінізмамі). Таму ўласнабеларуская літаратура ўказанага перыяду амаль не ведала такіх жанраў высокага «шцілю», як гераічная паэма, ода або трагедыя. Мы можам гаварыць пра існаванне гэтых жанраў у беларускай літаратуры толькі на польскай і лацінскай мовах.

З пункту гледжання фармавання новай беларускай літаратуры куды больш перспектыўным было «сярэдняе» барока, распаўсюджанае сярод дробнай шляхты, гараджан, шкаляроў, ніжэйшага духавенства. У адрозненне ад высокага, сярэдні «шціль» характарызаваўся большай ураўнаважанасцю, сузіральнасцю (філасофская лірыка). Сюды лягчэй пранікалі мясцовыя фальклорныя элементы (песенна-інтымная лірыка).

Урэшце, існаваў нізкі, блізкі да народнага «шціль», сацыяльнай асновай якога з'яўлялася беларускае сялянства, плябейскія слаі гарадскога насельніцтва, збяднелая шляхта. У формах нізкага «шцілю» знаходзілі сваё выяўленне антыфеадальная апазіцыя, настроі народных мас. На хвалі барока тут узніклі і развіваліся травестацыя і бурлеск, якія, па словах украінскага даследчыка І. Іваньё, сталі пераходным мосцікам ад старажытнай літаратуры да новай. Да арыгінальных з'явішчаў беларускага «народнага» барока трэба аднесці парадыйныя калядкі, макаранічныя вершы, батлеечную драму, часткова інтымную лірыку. Парадыруючы ўзоры высокага «шцілю», прасякаючыся фальклорнымі элементам, творы, што ўзніклі на гэтым узроўні барока, садзейнічалі адміранню старога пісьменства і фармаванню новага.

З «высокім» барока была звязана зыходная лінія развіцця беларускай літаратуры пераходнага перыяду, а з «сярэднім» і «нізкім» – узыходная. Усе тры «шцілі», вядома, не існавалі ізалявана. Межы іх акрэслены слаба. Паміж усімі «пластамі» барока ішло бесперапыннае ўзаемадзеянне, узаемапранікненне ідэй і мастацкіх формаў, доказам чаму могуць служыць некаторыя канты, калядкі, віншавальныя вершы.

Заканамернасці развіцця беларускай літаратуры пераходнага перыяду, барацьба ў ёй старога і новага пачатку найбольш выразна выявіліся ў барочнай паэзіі. Духоўная, тэацэнтрычная вершатворчасць, якая цалкам змяшчалася ў межах высокага «шцілю» барока, усё больш рашуча выцяснялася свецкай, антрапацэнтрычнай, якой больш падыходзілі сярэдні і нізкі «шцілі». У рэлігійных вершах і кантах з'яўляліся напаўфальклорныя элементы, што разбуралі іх «знутры» (вершы на прыезд у Вільню біскупа Шэмбака і наведанне Пінска біскупам Стафанам, якія, хутчэй за ўсё, належаць пяру Д. Рудніцкага). З духоўнай вершатворчасцю была звязана старая традыцыя, са свецкай – новыя, найбольш перспектыўныя тэндэнцыі.

Духоўная паэзія бытавала пераважна ў элітарных колах, уяўляла з сябе «вертоград» для выбраных. Стваралася яна на польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай і зрэдку старабеларускай мовах. Сюжэты і вобразы духоўнай паэзіі браліся з Бібліі, жыціяў святых (вершы пра Міколу, Варвару), заходнееўрапейскіх містыкаў. Гэтым вершаваным творам уласцівы рытарычная прыўзнятасць, ускладненая метафарычнасць, «цёмнасць», якую чытачу трэба было «праясніць», напружваючы ўяўленне. Найбольш значнымі прадстаўнікамі высокага «шцілю» ў паэзіі былі Сімяон Полацкі і Андрэй Белабоцкі, чыя мастацкая спадчына адначасова належыць беларускай і рускай літаратурам. Творам гэтых аўтараў уласцівы падкрэсленыя эмацыянальнасць, гіпербалізацыя пачуццяў, кантраснае супрацьпастаўленне супрацьлеглых пачаткаў і паняццяў – зямнога і вечнага, агіднага і цудоўнага, жыцця і смерці, зла і дабра, цемры і святла, вады і агню, якія знаходзяцца ў барацьбе, дыялектычным узаемапранікненні.

У параўнанні з рэлігійна-панегірычнай, элітарнай паэзіяй больш свецкі і дэмакратычны характар мела грамадска-філасофская лірыка. Яе развіццё было абумоўлена тым, што, звяртаючыся да пачуццяў чалавека, барока раскрывала і яго ўнутраны свет, узмацняла суб'ектыўны пачатак у літаратуры. Мікракосмас чалавечай душы цікавіў тады паэтаў больш, чым аб'ектыўны свет.

Заканамернасцямі пераходу ад старой беларускай літаратуры да новай было абумоўлена з'яўленне песенна-інтымнай лірыкі (папулярнай паэзіі), якая прадстаўлена сёння звыш 150 творамі. Яна ўжо цалкам свецкая па тэматыцы, блізкая да фальклору па выяўленчых сродках і да гутарковай мовы па лексіцы. Беларуская лірычная песня, пераважна ананімная і рукапісная па спосабу бытавання, сінтэзавала ў сабе як літаратурныя, так і народныя, фальклорныя традыцыі, нарадзілася на іх перакрыжаванні. Са славянскай і заходнееўрапейскай кніжнай паэзіяй яе родняць праявы таго ж барочнага стылю: арнаментальная квяцістасць, дэкаратыўнасць, метафарычнасць, рытарычны пафас. Адначасова ў папулярнай паэзіі выразна адчуваецца фальклорная стыхія. Тут наступіў характэрны для барока арганічны, творчы сімбіёз кніжнага і народнага, «высокага» і «нізкага» пачаткаў, традыцыйных тэндэнцый і наватарскіх пошукаў. У інтымнай паэзіі адбіўся народны погляд на каханне, які вызначаецца цвярозасцю, жыццёвай мудрасцю. Калі ў заходнееўрапейскай прыдворнай лірыцы малады чалавек толькі слёзна ўздыхае, толькі «тужыць» па аб'екту сваіх пачуццяў, дык тут герой і гераіня – пераважна людзі дзеяння. Энергічныя, кемлівыя, яны актыўна абараняюць сваё каханне – яно трактуецца як натуральнае права кожнага чалавека.

Урэшце, удзячным матэрыялам для выяўлення асаблівасцей беларускага барока з'яўляецца гумарыстычная і сатырычная паэзія, якая адносіцца, у цэлым, да таго ж «нізкага» і напаўфальклорнага «шцілю». Актуальны змест, асуджэнне розных заган феадальнага грамадства перададзены ў іх у алегарычна-метафарычнай форме. Найбольш цікавыя творы гэтага жанру – так званыя звярыныя гратэскі («Птушыны баль», «Нязгода птаства і сонд на круку», «Апісанные птушынай хворасці», «Ваенны паход грыбоў», «Камара цяжкі з дуба ўпадак»). Камізм такіх твораў засноўваецца на тым, што свет нібы пераварочваецца навыварат: птушкі, звяры, расліны аказваюцца ў чалавечай, тыповай для таго часу сітуацыі. Пад уздзеяннем барочнай эстэтыкі, а часткова і фальклору разбураліся звычныя лагічныя сувязі, спалучалася рэальнае і фантастычнае, сапраўднае і ўяўнае. Звычайныя жыццёвыя з'явы гратэскна гіпербалізаваліся. Усе сродкі былі скіраваны на тое, каб здзівіць чытача, ашаламіць яго нечаканасцю задумы і тым самым пазабавіць.

**Заключэнне.** Такім чынам, мы можам з поўным правам сёння гаварыць аб існаванні беларускага, адметнага варыянта еўрапейскага барока, якое мела значныя мастацкія каштоўнасці. Дзякуючы спалучэнню кніжных і фальклорных традыцый, барока стымулявала на Беларусі пераход да новай літаратуры. З'явіліся новыя віды і жанры мастацкай творчасці. Адкрыўся больш шырокі погляд на свет і чалавека.

## Літаратура

1. Мальдзіс, А. І. Беларускае барока / А. І. Мальдзіс // Роднае слова. – 1992. – С. 105–109.

2. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1985–1987.

*Паступіў 02.04.2010*